**А. І. Марэцкі,** *дэкан*
*факультэта завочнага навучання,*
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт*

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

Культура як сістэмная сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам, характарызуе ўзровень стану грамадства, супольнасці, нацыі, асобы, з'яўляецца люстэркам сённяшняй іх сутнасці і перспектыў іх развіцця.

Невыпадкова далейшае развіццё інтэлектуальнай, эмацыянальнай, мастацкай, прававой, эканамічнай, бытавой і іншых відаў духоўнай культуры народа, кожнага чалавека лічыцца першаснай умовай сацыяльнай устойлівасці грамадства.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, і ў прыватнасці факультэт завочнага навучання, рыхтуе спецыялістаў у розных галінах культуры: у сферах народнага мастацтва па ўсіх яго відах (музычнае, харэаграфічнае мастацтва, народныя рамёствы, традыцыйныя абрады і святы і інш.), культуралогіі (менеджмент сацыякультурнай сферы, менеджмент міжнародных культурных сувязей, інфармацыйныя сістэмы ў культуры), а таксама па бібліятэказнаўстве, сацыяльна-культурнай дзейнасці, музейнай справе і ахове гісторыка-культурнай спадчыны і інш. Адным словам, падрыхтоўка ажыццяўляецца па 11 спецыяльнасцях і 28 спецыялізацыях. На 1 студзеня 2012 г. на факультэце налічвалася 2852 студэнты і ў Мазырскім філіяле – 106.

З 2958 студэнтаў усіх курсаў і аддзяленняў універсітэта і Мазырскага філіяла 1290 навучаюцца на бюджэтнай форме, што складае 44%, і 1668 (56%) – на платнай.

Колькасць студэнтаў па курсах размяркоўваецца наступным чынам:

І курс – 675; ІІ курс – 629; ІІІ курс – 651; IV курс – 536; V курс – 467.

На аддзяленні культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці навучаецца 1261студэнт, на аддзяленні традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва – 507, на аддзяленні музычнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва – 563 і на аддзяленні інфармацыйна-дакументных камунікацый – 627.

Колькасць студэнтаў па рэгіёнах выглядае наступным чынам (у %):

Мінская вобласць – 31; Брэсцкая вобласць – 14; Гомельская вобласць – 13; Гродзенская вобласць – 11; Магілёўская вобласць – 10; Віцебская вобласць – 8; г.Мінск – 13.

Размеркаванне студэнтаў па ўзросце: 1994 г.н. – 19; 1993 г.н. – 47; 1992 г.н. – 76; 1991 г.н. – 198; 1990 г.н. – 293; 1989 г.н. – 317; 1988 г.н. – 303; 1987 г.н. – 241; 1986 г.н і далей – 1464.

Адной з асаблівасцей кантынгенту студэнтаў з'яўляецца тое, што абсалютная большасць з іх мае сярэднюю спецыяльную адукацыю і працуе ва ўсіх рэгіёнах краіны па абранай ва ўніверсітэце спецыяльнасці. Працэнт студэнтаў, якія навучаюцца на платнай форме і працуюць па абранай ва ўніверсітэце спецыяльнасці, складае каля 30. Зразумела, што ўсе студэнты, якія навучаюцца на бюджэтнай форме, працуюць па спецыяльнасці.

Ёсць падставы сцвярджаць, што факультэт і кафедры ў поўным аб'ёме выконваюць свае функцыі па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для патрэб рэспублікі ў сферы культуры. Так, за час існавання факультэта паспяхова завяршылі вучобу і атрымалі дыпломы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі звыш 17 тысяч чалавек. Сярод выпускнікоў факультэта першы намеснік Міністра культуры, начальнікі ўпраўленняў культуры Магілёўскай і Мінскай абласцей, шэраг артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», ансамбля народнай музыкі «Бяседа», вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры», супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, тысячы выпускнікоў розных спецыяльнасцей і спецыялізацый, якія працуюць ва ўсіх кутках нашай Радзімы. Другі прыклад. З 23 раёнаў Мінскай вобласці ў 19 начальнікамі ўпраўленняў культуры ў розныя часы працавалі ці працуюць выпускнікі факультэта.

Тыя ці іншыя пытанні, звязаныя з забеспячэннем вучэбнага працэсу на факультэце, рэгулярна абмяркоўваюцца на пасяджэннях савета факультэта і кафедраў. Дыяпазон разглядаемых пытанняў даволі шырокі і ахоплівае такія аспекты, як:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў ці якасці авалодання тым ці іншым вучэбным прадметам (кафедры псіхалогіі і педагогікі, замежных моў, інфармацыйных рэсурсаў, харэаграфіі);

– арганізацыя і кантроль за падрыхтоўкай курсавых і дыпломных работ студэнтаў і магістрантаў (кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры, тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, тэорыі музыкі і музычнай адукацыі);

– кіраўніцтва навуковай работай студэнтаў (кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці);

– праграмнае і метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу (кафедры этналогіі і фальклору, культуралогіі);

– сувязь з выпускнікамі (кафедра мастацтва эстрады).

На пасяджэнні кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы (2010/2011 год) сярод шэрагу пытанняў абмяркоўваліся дзве адкрытыя лекцыі загадчыка кафедры дацэнта А. І. Сцепанцова – «Маніторынг культурных патрэбнасцей» і «Арганізацыйная культура як сацыяльна-псіхалагічная аснова кіравання», прафесара С. Б. Майсяйчук – «Методыка стварэння сцэнарыя культурна-дасугавай праграмы», кафедры культуралогіі – старшых выкладчыкаў І. М. Варановіч «Тыпалогія культуры», А. У. Свечнікавай «Антычныя тыпы культуры». На аддзяленнях музычнага мастацтва і традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва залікі і экзамены праходзяць пры ўдзеле шырокага кола членаў кафедры ці прадметна-метадычных камісій, і ў гэтым кантэксце іх можна лічыць адкрытымі. На жаль, на некаторых кафедрах (псіхалогіі і педагогікі, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, інфармацыйных рэсурсаў і інш.) такія пытанні ў акрэслены перыяд не разглядаліся. Зразумела, адпаведным кафедрам трэба ўзмацніць работу ў гэтым кірунку. Абмяркоўваліся і іншыя пытанні работы са студэнтамі-завочнікамі. Напрыклад, былі заслуханы такія пытанні, як «Аб ідэйным змесце вучэбных культурна-дасугавых праграм» (кафедра педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці), «Выкладанне дысцыплін кафедры псіхалогіі і педагогікі на факультэце завочнага навучання» і інш. Адначасова канстатуем, што на ўсіх кафедрах рэгулярна абмяркоўваюцца такія пытанні, як вынікі ўступных экзаменаў, зацвярджэнне пытанняў да залікаў, экзаменацыйных білетаў, зацвярджэнне тэм магістарскіх дысертацый і дыпломных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работ студэнтаў, вынікі лабараторна-экзаменацыйных сесій, дзяржаўных экзаменаў і абароны дыпломных работ.

З мэтай выяўлення эфектыўнасці вучэбнага працэсу з пункту гледжання навучэнцаў праведзена анкетаванне студэнтаў III курса ўсіх аддзяленняў цягам зімовай лабараторна-экзаменацыйнай сесіі. У анкетаванні ўдзельнічаў 231 чалавек з 619. Супрацоўнікі аддзела менеджменту якасці адукацыі апрацавалі анкеты і вось якія вынікі атрымалі.

**1. Задаволенасць аб’ёмам і якасцю ведаў, атрымоўваемых на аўдыторных занятках па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла (філасофіі, сацыялогіі, замежнай мове, гісторыі Беларусі і інш.)**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 23 | 10 | 1 | 1 | 1 |
| % | | | 63,9 | 27,8 | 2,8 | 2,8 | 2,8 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 26 | 14 | 2 | 2 | 0 |
| % | | | 57,8 | 31,1 | 4,4 | 4,4 | 0 |
| КіСКД | 257 | 95 | 50 | 33 | 6 | 4 | 3 |
| **%** | | | 52,6 | 34,7 | 6,3 | 4,2 | 3,2 |
| ІДК | 145 | 55 | 23 | 26 | 2 | 2 | 2 |
| % | | | 41,8 | 47,3 | 3,6 | 3,6 | 5,5 |
| Разам | 619 | 231 | 122 | 83 | 11 | 9 | 7 |
| **%** | | | 52,8 | 35,9 | 4,4 | 3,9 | 3,0 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **91,3** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **93,5** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+2,2** |

*Тут і далей у адказах: 1 – так; 2 – хутчэй, так; 3 – хутчэй, не; 4 – не; 5 – цяжка даць адказ.

Пры гэтым трэба адзначыць, што на пытанні табл. 1 аб задаволенасці аб’ёмам і якасцю ведаў па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла студэнты адказвалі па выніках выканання вучэбнага плана па замежнай мове, гісторыі Беларусі, эканамічнай тэорыі, а на пытанні табл. 2 – адпаведна па дысцыплінах, якія выкладаліся на I і II курсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2. Задаволенасць аб'ёмам і якасцю ведаў, атрымоўваемых на аўдыторных занятках па дысцыплінах агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыкла**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 15 | 17 | 3 | 1 | 0 |
| % | | | 41,7 | 47,2 | 8,3 | 2,8 | 0 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 11 | 15 | 11 | 6 | 0 |
| % | | | 24.4 | 33,3 | 24,4 | 13,3 | 0 |
| КіСКД | 257 | 95 | 46 | 34 | 9 | 4 | 2 |
| **%** | | | 48,4 | 35.8 | 9,5 | 4.2 | 2.1 |
| ІДК | 145 | 55 | 14 | 27 | 9 | 1 | 2 |
| % | | | 25,5 | 49,1 | 16,4 | 1,8 | 3,6 |
| Разам | 619 | 231 | 86 | 93 | 32 | 12 | 4 |
| **%** | | | 37,2 | 40,3 | 13,9 | 5,2 | 1,7 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **90,5** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **91,4** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+0,9** |

Адказы на пытанні табл. 3 і 5 дапаўняюць і нейкім чынам канкрэтызуюць папярэднія адказы.

**3. Задаволенасць узроўнем перадачы ведаў (выкарыстанне разнастайных методык, аўдыявізуальных тэхнічных сродкаў навучання)**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 5 | 22 | 7 | 2 | 0 |
| % | | | 13,9 | 61,1 | 19,4 | 5,6 | 0,0 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 10 | 12 | 16 | 5 | 1 |
| % | | | 22.2 | 26,7 | 35,6 | 11,1 | 2,2 |
| КіСКД | 257 | 95 | 41 | 28 | 13 | 12 | 3 |
| **%** | | | 43,2 | 29,5 | 13,7 | 12,6 | 3,2 |
| ІДК | 145 | 55 | 15 | 13 | 18 | 6 | 6 |
| % | | | 27,3 | 23.6 | 32,7 | 10,9 | 10,9 |
| Разам | 619 | 231 | 71 | 75 | 54 | 25 | 10 |
| **%** | | | 30,7 | 32,5 | 23,4 | 10,8 | 4,3 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **83,1** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **86,6** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+3,5** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**4. Задаволенасць дaступнасцю электронна-інфармацыйных рэсурсаў пры падрыхтоўцы да заняткаў**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 12 | 18 | 5 | 2 | 0 |
| % | | | 33,3 | 50,0 | 13,9 | 5,6 | 0,0 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 10 | 11 | 12 | 8 | 3 |
| % | | | 22,2 | 24,4 | 26,7 | 17,8 | 6,7 |
| КіСКД | 257 | 95 | 34 | 36 | 17 | 8 | 1 |
| **%** | | | 35,8 | 37,9 | 17,9 | 8,4 | 1,1 |
| ІДК | 145 | 55 | 11 | 24 | 10 | 8 | 5 |
| % | | | 20,0 | 43,6 | 18,2 | 14,5 | 9,1 |
| Разам | 619 | 231 | 67 | 89 | 44 | 26 | 9 |
| **%** | | | 29,0 | 38,5 | 19,0 | 11,3 | 3,9 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **74,4** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **86,5** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+12,1** |

Асноўным кірункам вучэбнай работы на факультэце з’яўляецца самастойная праца студэнтаў, што і прадугледжана вучэбнымі планамі. Гэтая акалічнасць мяняе і характар выкладання. Так, на ўстановачнай сесіі перад выкладчыкамі стаіць задача даць уяўленне не столькі пра сістэму ведаў, колькі аб вучэбнай дысцыпліне ў цэлым, яе структуры і змесце, звярнуць увагу студэнтаў на найбольш фундаментальныя паняцці вучэбнага курса і, што не менш важна, указаць шляхі самастойнага авалодання ведамі, навыкамі і ўменнямі. Задача агляднай лекцыі – дапамагчы студэнту абагульніць самастойна вывучаны ў міжсесійны перыяд матэрыял, прывесці яго ў сістэму, даць адказы на найбольш складаныя пытанні. Адсюль выцякаюць асобыя патрабаванні да аб’ёму і характару інфармацыі, якая паведамляецца выкладчыкамі, методыкі яе данясення студэнтам. Улічваючы, што асноўная частка вучэбнага матэрыялу выносіцца на самастойнае вывучэнне, вялікае значэнне мае распрацоўка заданняў пошуковага, творчага характару. Навучанне методыцы самастойнай работы па засваенні вучэбнага матэрыялу, яе планаванні і арганізацыі з’яўляецца адным з важных кампанентаў дзейнасці выкладчыкаў.

Выкладанне на факультэце арганізуецца як своеасаблівая сістэма кіравання самастойнай вучэбнай дзейнасцю студэнтаў і ўключае наступныя структурныя элементы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пастаноўка мэты і задач вучэбнага курса;
– вызначэнне аб’ёму і зместу вучэбнага матэрыялу;
– выбар сродкаў і спосабаў перадачы ведаў;
– тлумачэнне вучэбнага матэрыялу студэнтам на аўдыторных занятках;
– планаванне і арганізацыя самастойнай вучэбнай работы студэнтаў, распрацоўка метадычных рэкамендацый па вывучэнні адпаведнай дысцыпліны;
– кіраванне самастойнай работай студэнтаў у міжсесійны перыяд;
– кантроль за якасцю ведаў студэнтаў.

Такім чынам, дзейнасць выкладчыка на завочнай форме навучання ўмоўна можна падзяліць на тры часткі:
– падрыхтоўчая (падрыхтоўка да вучэбных заняткаў і планаванне самастойнай работы студэнтаў);
– непасрэдная работа са студэнтамі ў перыяд лабараторна-экзаменацыйных сесій;
– апасродкаванае кіраванне самастойнай работай студэнтаў у перыяд паміж сесіямі.

Пры ўсёй значнасці кожнай з гэтых частак трэба выдзеліць асаблівую ролю першай, калі закладаюцца асновы кіравання самастойнай вучэбнай работай студэнтаў. Менавіта на гэтым этапе праграміруецца ўся сістэма педагагічнага ўздзеяння: вызначэнне аб’ёму самастойнай работы, распрацоўка дамашніх заданняў, падрыхтоўка метадычных указанняў і інш. І хоць студэнты ў цэлым даволі высока ацанілі ўзровень кантролю ведаў, тым не менш работы ў гэтым кірунку хапае для дэканата і кафедраў.

**5. Задаволенасць узроўнем кантролю ведаў (бягучы кантроль у час заняткаў, кантроль СРС):**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 18 | 10 | 3 | 1 | 1 |
| % | | | 50,0 | 27,8 | 8,3 | 2,8 | 2,8 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 17 | 16 | 4 | 4 | 3 |
| % | | | 37,8 | 35.6 | 8,9 | 8,9 | 6.7 |
| КіСКД | 257 | 95 | 34 | 44 | 6 | 5 | 7 |
| **%** | | | 35,8 | 46,3 | 6,3 | 5,3 | 7,4 |
| ІДК | 145 | 55 | 21 | 21 | 9 | 2 | 3 |

*Працяг табл.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| % | | | 38,2 | 38,2 | 16,4 | 3,6 | 5,5 |
| Разам | 619 | 231 | 90 | 91 | 22 | 12 | 14 |
| **%** | | | 39,0 | 39,4 | 9,5 | 5,2 | 6,1 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **87,5** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **87,9** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+0,4** |

Праводзіцца пэўная работа па прыцягненні студэнтаў і магістрантаў да навуковай работы. Пры ўсёй сукупнасці аб’ектыўных прычын (сумяшчэнне вучобы і работы, загружанасць на рабоце, сямейныя абставіны і інш.) шэраг студэнтаў маюць даволі высокія вынікі і пасля пастпаюць у магістратуру і аспірантуру. Так, студэнты і выпускнікі факультэта пастаянна бяруць удзел у выніковых навуковых канферэнцыях студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў універсітэта. З дакладамі на апошняй у красавіку 2011 г. выступілі звыш 30 чалавек. Грунтоўнымі дакладамі адзначыўся шэраг студэнтаў, у тым ліку А. У. Качурка (310 група) «Поэтика серебряного века в литературе и музыке» (навуковы кіраўнік – дацэнт Л. А. Шкор), В. В. Грышчанка (411а група) «Сацыяльна-культурны механізм першаснай інкультурацыі» (навуковы кіраўнік – прафесар Л. Е. Раманенка) і інш.

Студэнты і магістранты факультэта бралі таксама ўдзел у навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца па-за межамі ўніверсітэта, апублікавалі навуковыя работы. Так, апублікаваны артыкул Н. М. Шчалканогавай (511б група), прысвечаны станаўленню фандрайзінгу як новага напрамку фінансавага менеджменту ў сферы культуры (на матэрыялах г. Ліды Гродзенскай вобласці), артыкул А. У. Звалінскай (510 група), прысвечаны мастацкім асаблівасцям дойлідства ў Беларусі. Студэнтка В. Л. Строганава (312 група) апублікавала шэраг сваіх вершаў. Студэнтка-выпускніца гэтага года К. В. Алейнік (506 група) – лаўрэат міжнародных конкурсаў, стала лаўрэатам спецыяльнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў за 2011 год.

Разам з тым трэба падкрэсліць, што кафедрамі выкарыстоўваюцца далёка не ў поўнай меры тыя магчымасці, якія маюцца ў студэнцкім асяроддзі. Вышэй называлася, што звыш 30 студэнтаў і магістрантаў выступілі з дакладамі на апошняй выніковай канферэнцыі. З аднаго боку, здаецца, і нямала. Калі ж параўнаем з удзелам студэнтаў дзённай формы навучання, то карціна будзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мецъ зусім іншы выгляд. З дакладамі на ёй выступілі больш 700 студэнтаў стацыянара. Найбольш актыўна ў гэтым кірунку працуе кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці, 5 выкладчыкаў якой, да прыкладу, з'яўляліся кіраўнікамі навуковых работ студэнтаў-завочнікаў мінулага вучэбнага года. У той жа час мае месца, калі ні адзін выкладчык кафедры, як у 2010/2011 навучальным годзе, не задзейнічаны ў гэтай рабоце са студэнтамі завочнай формы навучання. Тут можна назваць усе спецыяльныя кафедры аддзяленняў ТБКіСМ (за выключэннем прафесара П. А. Гуда), ІДК, большасці агульнаадукацыйных кафедраў.

Невыпадкова на пытанні табл. 6 аб задаволенасці ўзроўнем навукова-даследчай дзейнасці 51,7 % студэнтаў далі адмоўны адказ. Больш таго, гэты паказчык панізіўся на 2,4 пазіцыі ў параўнанні з 2010/2011 нав. годам. Значыць, дэканату і кафедрам трэба ўлічыць недахопы па прыцягненні студэнтаў да навукова-даследчай работы.

**6. Задаволенасць узроўнем далучэння да навукова-даследчай дзейнасці (навуковыя канферэнцыі, публікацыя навуковых матэрыялаў, конкурсы, гранты і т.д.)**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 9 | 10 | 7 | 1 | 9 |
| % | | | 25,0 | 27,8 | 19,4 | 2.8 | 25,0 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 8 | 9 | 5 | 33 | 20 |
| % | | | 17,8 | 20,0 | 11,1 | 6,7 | 44,4 |
| КіСКД | 257 | 95 | 24 | 24 | 10 | 19 | 19 |
| **%** | | | 25,3 | 25,3 | 10,5 | 20,0 | 20,0 |
| ІДК | 145 | 55 | 2 | 0 | 6 | 1 | 46 |
| % | | | 3,6 | 0,0 | 10,9 | 1,8 | 83,6 |
| Разам | 619 | 231 | 43 | 43 | 28 | 24 | 94 |
| **%** | | | 18,6 | 18,6 | 12,1 | 10,4 | 40,7 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **51,7** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **49,3** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **-2,4** |

Як вядома, для дасягнення больш высокай эфектыўнасці пры засваенні вучэбнага матэрыялу студэнтамі трэба ўзброіць іх вучэбна-метадычнымі комплексамі, іншымі папяровымі і электроннымі носьбітамі. У цэлым задаволенасць даступнасцю электронна-інфармацыйных рэсурсаў пры падрыхтоўцы да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткаў узрасла ў параўнанні з мінулым вучэбным годам на 12,1 пазіцыі і складае 86,5%, а задаволенасць колькасцю і даступнасцю камп’ютарнай тэхнікі ў вучэбных аўдыторыях, у бібліятэцы – на 11,1 пазіцыі і складае 77,9%. Тым не менш тут таксама маецца вялікі рэзерв для ўдасканалення вучэбнага працэсу.

**7. Задаволенасць колькасцю і даступнасцю камп’ютарнай тэхнікі ў вучэбных аўдыторыях, бібліятэцы**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 11 | 15 | 3 | 1 | 2 |
| % | | | 30,6 | 41,7 | 8,3 | 2,8 | 5,6 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 11 | 10 | 10 | **7** | 6 |
| % | | | 24,4 | 22,2 | 22,2 | 15,6 | 13,3 |
| КіСКД | 257 | 95 | 34 | 24 | 19 | 14 | 5 |
| **%** | | | 35,8 | 25,3 | 20,0 | 14,7 | 5,3 |
| ІДК | 145 | 55 | 12 | 18 | 13 | 7 | 7 |
| % | | | 21,8 | 32,7 | 23,6 | 12,7 | 12,7 |
| Разам | 619 | 231 | 68 | 67 | 45 | 29 | 20 |
| **%** | | | 29,4 | 29,0 | 19,5 | 12,6 | 8,7 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | | | **66,8** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | | | **77,9** |
| **Дынаміка** | | | | | | | **+11,1** |

**8. Задаволенасць матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем вучэбнага працэсу (аўдыторыі, музычныя інструменты, касцюмы, спартыўная база, бібліятэка, бытавыя ўмовы)**

| Аддзяленне | Колькасць студ. па спіску | Колькасць анкет | Далі адказ* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| ММ | 97 | 36 | 8 | 19 | 4 | 2 | 1 |
| % | | | 22.2 | 52.8 | 11,1 | 5,6 | 2,8 |
| ТБКіСМ | 120 | 45 | 9 | 5 | 14 | 12 | 4 |
| % | | | 20,0 | 11,1 | 31,1 | 26,7 | 8.9 |
| КіСКД | 257 | 95 | 42 | 23 | 20 | 7 | 4 |
| **%** | | | 44,2 | 24,2 | 21,1 | 7,4 | 4,2 |
| ІДК | 145 | 55 | 10 | 16 | 0 | 3 | 27 |
| % | | | 18,2 | 29,1 | 0,0 | 5,5 | 49.1 |
| Разам | 619 | 231 | 69 | 63 | 38 | 24 | 36 |

*Працяг табл.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| % | 29,9 | 27.3 | 16.5 | 10,4 | 15.6 |
| **% задаволеных спажыўцоў 2010/2011 вуч. года** | | | | | **79,4** |
| **% задаволеных спажыўцоў 2011/2012 вуч. года** | | | | | **73,7** |
| **Дынаміка** | | | | | **-5,7** |

Акрэсленыя пытанні не з’яўляюцца адзінымі на сённяшнім этапе развіцця факультэта, але яны значныя на бягучы навучальны год і, думаецца, на перспектыву. Спадзяюся, што названыя і іншыя пытанні будуць дапоўнены ў іншых выступленнях і прапановах на пасяджэннях секцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ